# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

Дом, у якім утульна ўсім!

berezino2.schools.by



*ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно»* *№ 2 (сакавік)*

## ЛЮТАЎСКІ КАЛЕЙДАСКОП

***21 лютага ўрачыстай лінейкай завяршыўся Тыдзень роднай мовы, у рамках якога ва ўстанове было наладжана шмат мерапрыемстваў: наведанне Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы ў г. Мінску і гарадской бібліятэкі г. Беразіно для ўдзелу ў мерапрыемстве, прысвечаным С. Алексіевіч, пазнавальна-займальная праграма "Беларускі нацыянальны касцюм", конкурс чытальнікаў "Гучыць беларуская мова", інтэлектуальныя гульні "Разумнікі і разумніцы", "Еўфрасіння Полацкая", "Падарожжа ў часе", моўныя хвілінкі "Алфавіту садзе", "Адкуль прыйшла назва месяца", "Загадкі календара", конкурс "Буслік–2013". Пераможцы былі адзначаны Падзячнымі граматамі.***

⇨ **25 лютага і 1 сакавіка прайшло традыцыйнае школьнае мерапрыемства "Вучань года–2013" I і II ступені, у якім прынялі ўдзел вучні 2-4 і 5-8 класаў адпаведна. Згодна з палажэннем, канкурсанты прадставілі візітоўку "Быць беражлівым – гэта модна", дамашняе заданне "Падары рэчам другое жыццё", а таксама паказалі свае веды ў інтэлектуальных конкурсах. Пераможцамі названы Аліна Жукоўская (3 "Б") і Марына Лапцёнак (3 "Б"), Дар'я Кулік (8 "А") і Макар Шпакоўскі (7 "Б"), якія будуць прадстаўляць нашу школу на раённым конкурсе.**

⇨ ***Вучань 8 "В" класа - Уладзіслаў Залан па выніках абласных спаборніцтваў "Снежны снайпер" увайшоў у склад каманды школьнікаў, якія будуць прадстаўляць Мінскую вобласць у час Рэспубліканскіх спаборніцтваў.***

## ВІТАЙЦЕ - "МІНІ-МІС"!





(Інтэрв'ю чытайце на стар. 2).

# ВІТАЙЦЕ - “МІНІ-МІС”!

***Вучаніца ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно” ў выніку канкурэнтнай барацьбы заваявала тытул “Міні-міс Беразіно”. Напярэдадні свята вясны і прыгажосці гутарым з пераможцай і прызнанай прыгажуняй раёна – трэцякласніцай Марыяй Рабкевіч.***

**- Цікава, як праходзіць падрыхтоўка да конкурсаў такога ўзроўню?**

*- Калі я даведалася, што наладжваецца ў горадзе “Міні-міс”, і вырашыла прыняць удзел, адразу пачалася актыўная работа ў гэтым напрамку. Дзесьці каля трох-чатырох тыдняў хадзіла на дэфіле, рыхтавала і развучвала танец “Валёнкі”. Да пачатку мерапрыемства родныя дапамаглі набыць святочную сукенку белага колеру з малочнымі і чырвонымі стужкамі. Вялікі дзякуй усім тым, хто быў побач у хвалюючыя і трывожныя моманты, аказваў падтрымку і дапамагаў спраўляцца з цяжкасцямі.*

**- Ці ўзнікалі думкі аб тым, што станеш першай?**

*- Перамога стала для мяне поўнай нечаканасцю. Хваляванне не пакідала ад пачатку мерапрыемства і да фіналу. За прыкладзеныя намаганні я стала ўладальніцай не толькі тытула, але і планшэта, дыядэмы і чырвонай стужкі.*

**- Хто прыйшоў цябе падтрымаць у адказны момант?**

*- Бацькі, бабуля, аднакласнікі, настаўнікі – Таццяна Мікалаеўна і Лідзія Вячаславаўна, сяброўка і хросная.*

**-Ахарактарызуй сябе трыма прыметнікамі.**

*- Калі быць сумленнай, то не вельмі паслухмяная, але клапатлівая і добрая.*

**- Як ты арганізоўваеш свой вольны час?**

*- Маляванне стала любімым заняткам у апошні час. Прычым, не мае значэння - фарбамі ці алоўкамі. Імкнуся адлюстраваць тое, што вакол нас – прыроду, лес, вуліцу.*

**- Ці ёсць у цябе любімыя кветкі?**

*- Канечне, ёсць, як і ў любой дзяўчынкі. Больш за ўсё падабаюцца пяшчотныя белыя лілеі, палымяныя чырвоныя цюльпаны і ружы.*

**- Марыя, якім колерам у адзенні ты аддаеш перавагу?**

*- Апошнім часам перавагу аддаю ружоваму, разам з усімі яго адценнямі.*

**- Якая літаратура цябе цікавіць?**

*- Увогуле, люблю пераглядаць рознага роду энцыклапедыі і знаходзіць там адказы на свае пытанні. Цяпер чытаю пазнавальную кнігу “Жыццё лесу”, якую падарыла бабуля. А вось “Энцыклапедыя для дзяўчынак” стала для мяне сапраўднай скарбонкай карысных парад.*

**- Твая любімая музыка?**

*- Падабаецца слухаць дзіцячыя кампазіцыі. Некаторыя з іх я знаходжу ў інтэрнэце.*

**- Які са школьных прадметаў вабіць цябе больш за ўсё?**

*- Ён нават не адзін. Паколькі люблю чытаць і маляваць, то гэта руская літаратура і маляванне, а таксама англійская мова.*

**- Ці задумвалася ўжо наконт будучай прафесіі?**

*- Думак шмат, і ўсе яны такія розныя. Напрыклад, выклікае інтарэс дызайнерская дзейнасць па стварэнні адзення. Не апошняе месца ў спісе займаюць прафесіі ўрача і настаўніка.*

**- Твая любімая страва?**

*- Вельмі люблю смажаную бульбу. Некаторыя рэчы ўжо магу прыгатаваць самастойна. Гэта салаты з гародніны, крабавых палачак і кукурузы, макароны з сасіскамі.*

**- Марыя, у якіх яшчэ конкурсах ты б абавязкова прыняла ўдзел?**

*- Паколькі захапляюся маляваннем, то менавіта ў конкурсах такога кшталту хацелася б праявіць сябе і паспрабаваць сілы ў барацьбе с сапернікамі.*

**- Чаго пажадала б наступным удзельніцам конкурсаў прыгажосці тыпу “Міні-міс”?**

*- Дзяўчаты, не сумуйце, калі нават і не дасягняце заветнага п’едэстала. Удзел у падобных конкурсах – гэта маса яркіх эмоцый, незабыўных момантаў і карысных урокаў на будучыню.*

# ЯК ПАВІНШАВАЦЬ МАТУЛЮ СА СВЯТАМ 8 САКАВІКА?

***На календары - пачатак сакавіка. За акном - сонейка радуе нас сваімі праменьчыкамі. На душы - вясна. Хутка ў свеце будзе адзначацца свята жаночай прыгажосці - 8 Сакавіка. Напярэдадні святочных урачыстасцей члены клуба «Юны журналіст» высвятляюць, якім чынам збіраюцца мужчыны павіншаваць сваіх любімых і дарагіх жанчын.***





**Макар (7 «Б»):**

*8 Сакавіка - гэта міжнародны жаночы дзень. Самая галоўная для мяне жанчына на свеце - матуля. Звычайна я дару ёй кветкі. Не менш важным з'яўляецца для матулі і падарунак, створаны сваімі рукамі. Але ўсё гэта не зможа замяніць праяўленых у адносінах да роднага чалавека любві і дабрыні.*



**Данііл (7 «Б»):**

*- Дарагая мая мамачка! Віншую цябе са святам вясны. Ад усяго сэрца жадаю табе добрага здароўя, дабрабыту, шчасця і радасці. Мне не хапае слоў, каб выказаць уся маю бязмежную любоў і пяшчоту да цябе.*
*Будзь самай шчаслівай, нягледзячы на складанасці ў жыцці.*

**Дзяніс (7 «Б»):**

***- 8 Сакавіка - Міжнародны жаночы дзень. Дзень нашых матуль, бабуль і сясцёр. Хочацца да свята парадаваць сваіх блізкіх. У гэтым годзе мы сабраліся кампаніяй, каб прыгатаваць падарункі, бо разам заўсёды весялей і цікавей. Хлопцы прынеслі фарбы, пластылін, каляровую паперу, ніткі, прыбор для выпальвання, ватман і кардон. Ігар прапанаваў зрабіць вялікую святочную насценгазету. З мастацкіх часопісаў мы павыразалі постаці жанчын і прыклеілі да іх фотаздымкі нашых матуль. Пасля створаныя кампазіцыі мы аздобілі вясёлымі подпісамі. Мішына матуля, напрыклад, скакала на кані каля старадаўняга замка, маці Максіма танцавала ў бальнай сукенцы. Газета атрымалася яркай і цікавай. Потым кожны з нас зрабіў для сваёй матулі асабісты падарунак. Антон на апрацаванай дошцы выпаліў прыгожы надпіс «Самай лепшай матулі ў свеце». Мікіта сплёў з нітак рознакаляровую сурвэтку, а Алег са старой фотастужкі зрабіў арыгінальныя закладкі для кніг. Я ўпэўнены, што нашы матулі будуць задаволеныя.***

**Ілья (8 «В»):**

*- 8 Сакавіка я прыду дадому з вялікім букетам кветак і скажу ёй: «Матуля, я хачу, каб гэты дзень быў для цябе самым шчаслівым! Са святам!».*

**Сяргей (8 «Б»):**

*- Я падару матулі ружы. Таму што яна такая ж прыгожая, як і гэтыя цудоўныя кветкі. Думаю, што матулі будзе вельмі прыемна.*

# ГІСТОРЫЯ СВЯТА 8 САКАВІКА



**Чаму Міжнародны жаночы дзень святкуюць менавіта 8 сакавіка?**

***Раней у многіх краінах жанчыны не мелі права голасу, не маглі вучыцца. Дзяўчынкам не дазвалялі хадзіць у школу. Вядома, іх гэта абурала! Потым жанчынам дазволілі працаваць. Але ўмовы працы былі цяжкімі. Тады ў Нью-Ёрку больш за 150 гадоў таму назад працаўніцы прайшлі «маршам пустых каструль». Яны гучна білі ў пустыя каструлі і патрабавалі павышэння зарплаты, паляпшэння ўмоў працы і роўныя правы для жанчын і мужчын. Гэта так здзівіла ўсіх, што падзею сталі называць Жаночым днём. Потым на працягу многіх гадоў жанчыны ладзілі акцыі пратэстаў. Яны патрабавалі выбарчага голасу, выступалі супраць жудасных умоў працы. Тады было вырашана выбраць адзін агульны «жаночы дзень» для многіх краін. Жанчыны розных краін дамовіліся, што менавіта ў гэты дзень будуць нагадваць мужчынам, што жанчын трэба паважаць. Упершыню Міжнародны жаночы дзень быў праведзены 19 сакавіка 1911 г. у Германіі, Аўстрыі, Даніі і некаторых іншых еўрапейскіх краінах. Гэтая дата была абрана жанчынамі Германіі. У Савецкім Саюзе 8 Сакавіка доўгі час было звычайным рабочым днём. Але 8 мая 1965 года, напярэдадні 20-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, Міжнародны жаночы дзень быў аб'яўлены святочным. У 1977 годзе ААН (Арганізацыя Аб'яднаных Нацый) абвясціла 8 сакавіка днём барацьбы за жаночыя правы - Міжнародным жаночым днём. Гэты дзень абвешчаны нацыянальным выхадным у многіх краінах. 8 Сакавіка - першае свята вясны - самага прыгожага часу года.***

**А як і калі віншуюць жанчын у іншых краінах?**
**Бо не ўсюды 8 Сакавіка - афіцыйнае свята.**

***У Злучаных Штатах і краінах Заходняй Еўропы вясной святкуюць Дзень маці. Раней у чацвёртую нядзелю Вялікага посту людзі прыносілі дары ў мясцовую сельскую царкву. У наш час дзеці дораць сваім мамам віншавальныя паштоўкі і падарункі, уладкоўваюць «дзень паслушэнства».***

***Іспанцы "жаночы дзень" святкуюць 5 лютага. Гэта дзень памяці святой Агеды - заступніцы жанчын.***

***Народы Паўднёвай і Паўночнай Індыі пакланяюцца багіням шчасця, прыгажосці і дома - Лакшмі і Парваці. Святкуюць гэтыя дні ў верасні-кастрычніку. Людзі ўпрыгожваюць дамы кветкамі, дораць жанчынам падарункі.***

***Японцы 3 сакавіка святкуюць Хіна-Мацуры - свята дзяўчынак. Гэты дзень яшчэ называюць святам цвіцення персіка. У старажытнасці ў гэты дзень з паперы выразалі ляльку. Потым цацку спальвалі або кідалі ў ваду. Агонь і вада павінны былі забраць прэч усе няшчасці. Але з часам лялек перасталі знішчаць. Цяпер іх робяць з гліны і дрэва, апранаюць у шаўковыя сукенкі. Часам нават ладзяць выставы лялек.***

*Сардэчна віншуем усіх жанчын і дзяўчат СШ № 2 з цудоўным вясновым святам - Міжнародным жаночым днём!*



**Няхай жыццё шчаслівым будзе,
Раскошным, яркім, светлым!
Хай лёс не падвядзе,
Прыносіць кожны дзень задавальненне
І мноства перамог, і плённых дасягненняў.
Няхай жаданае чакае на шляхах жыцця,
Сапраўдным святам стане 8 Сакавіка!**

Мая любімая настаўніца – выкладчыца матэматыкі, Галіна Уладзіміраўна. Яна спадабалася мне з самага першага ўрока. Матэматыка – даволі складаны прадмет, але Галіна Уладзіміраўна тлумачыць яго так добра, даступна і цікава, што ў мяне атрымліваецца рашаць нават складаныя задачкі. Урокі матэматыкі праходзяць вельмі хутка. Галіна Уладзіміраўна сустракае нас заўсёды ветліва, з усмешкай. Да яе можна падысці з пытаннем, калі што-небудзь не зразумела. Яна дапаможа кожнаму, калі нешта не атрымліваецца. А яшчэ мая любімая настаўніца вельмі прыгожая.

*Кацярына Аўтуховіч.*

У кожнага чалавека, калі ён хадзіў у школу, былі любімыя настаўнікі. Я вучуся яшчэ толькі ў пятым класе. І для мяне самай любімай з'яўляецца мая "першая настаўніца". Менавіта яна навучыла мяне чытаць, пісаць і сябраваць. Ёй мы давяралі ўсе свае сакрэты, кожнага яна ўмела выслухаць, заўсёды дапамагала нам. Для нас яна была "другой матуляй". Я ўпэўнены, што шмат вучняў з майго класа напішуць менавіта пра яе. А завуць маю любімую настаўніцу Марыя Іванаўна Пелагейчанка.

*Кірыл Рахманаў.*

Колькі радасці выклікае ў дзяцей слова "мама"! Маці адзіная, непаўторная, ласкавая, каханая. Мама – першае слова, што вымаўляе малое неразумнае дзіця, якое з першых мінут свайго жыцця любіць яе. Словы матулі заўсёды прыгожыя, добрыя, ласкавыя, лагодныя для твайго сэрца. Маці адзіная. Мы, яе дзеці, павінны любіць матулю, шанаваць і заўсёды ёй дапамагаць. Самы дарагі чалавек на свеце – гэта матуля.

**Юлія Піскун.**

Самы родны, дарагі чалавек у свеце для нас з маленства – маці. Яна заўсёды хвалюецца за нас, пачынаючы ад нашых першых крокаў, радуецца нашай першай адзнацы. Але гады ідуць шпарка, і вось мы закончылі першы, другі, шосты клас. Мы падрастаем, а з намі ўзрастаюць і матуліны перажыванні, і клопаты. Колькі трэба вытрымаць хвалявання на нашым першым экзамене, на выпускным балі. І вось у нас ужо – свае сем'і, свае дзеці і свае клопаты. З кожным годам мы ўсё радзей бываем побач з матуляй. А яна, застаўшыся адна, успамінае часы, калі мы былі дзецьмі. Нягледзячы на сваю сталасць, мы павінны шанаваць нашых матуль, казаць ім добрыя словы, дарыць ласку і цяпло.

**Вікторыя Белая.**

Мой класны кіраўнік – Вікторыя Валер'еўна. Нягледзячы на сваю маладосць, яна вельмі вопытны настаўнік. На ўроках у яе цікава. Настаўніца захапляе сваім майстэрствам. Распрацоўвае розныя цікавыя заданні, дзе мы малюем, спяваем, ствараем дыялогі. Пасля ўрокаў імкнецца арганізаваць цікавыя мерапрыемствы, у якіх мы з задавальненнем удзельнічаем. Мне вельмі падабаецца замежная мова і мая настаўніца.

**Юлія Калянковіч.**

**Маці – самы першы чалавек на зямлі, з якім сустракаецца малыш, што нарадзіўся. Яна вельмі любіць дзіця, корміць яго і клапоціцца пра яго здароўе, вучыць яго ўсміхацца, поўзаць і рабіць першыя крокі. Маці – самы першы настаўнік. Хто цябе навучыў маляваць алоўкам і фарбамі, гаварыць ветлівыя словы? Хто праспяваў табе першую песню і расказаў першую казку? Канечне ж, маці!**

**Аляксандра Сай.**

## У ГАСЦЯХ У ПСІХОЛАГА

*- Заўтра мне трэба пісаць вельмі складаную кантрольную работу. Сёння трэба да яе грунтоўна падрыхтавацца, але сяброўка нечакана запрасіла на дзень нараджэння. Пайсці я, зразумела, не магу, але і выглядаць «заучкой» у вачах іншых мне не хочацца. Падкажыце, як знайсці кампраміс і адмовіцца ад запрашэння?*

**- У той момант, калі вы разумееце, што хочаце адмовіцца ад чаго-небудзь, часам гэта цяжка зрабіць. Мы не заўсёды ведаем, як сказаць «не» ў той ці іншай сітуацыі і пры гэтым не ўступіць у канфлікт. Перш за ўсё, варта разумець, што людзі, якія не паважаюць вашага рашэння, якім бы яно ні было, не варты вашых перажыванняў. Калі яны - сапраўдныя сябры або добрыя знаёмыя, то з разуменнем паставяцца да прынятага вамі рашэння, нават калі апошняе ім не будзе падабацца.**

**Спосабы сказаць «не»: 1. Скажы «не». Адмаўляй цвёрда,алеветліва.Гэтадазволіцьтабенепрацягваць размову. «Не» і ўсё! 2. Увесь час паўтарай адну і тую ж прычыну, напрыклад, «Не магу». 3. Спасылайся на фізічны стан, напрыклад, алергія, хвароба.**

**Дарэчы, свае пытанні можна штодзённа ананімна задаць псіхолагу, даслаўшы іх на адрас электроннай пошты berezinosch2.edu@tut.by. Вы абавязкова атрымаеце адказ і не застанецеся сам-насам з цяжкасцямі. Памятайце, любая праблема мае вырашэнне!**



ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА
ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно» 223311, горад Беразіно, вуліца Мультана, 19.
Эл. пошта: berezinosch2.edu@tut.by
Сайт: berezino2.schools.by
Клуб «Юны журналіст»

**ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА ВУЧНЯЎ І НАСТАЎНІКАЎ!**